**УСТАНОВА АДУКАЦЫІ**
**“БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**
**КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ”**

УДК 316.723:28-678]:930.85(476)(043.3)

**ТАТАРЭВІЧ**
**МАРЫНА АЛЯКСАНДРАЎНА**

# КУЛЬТУРНАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ НОСЬБІТАЎ МУСУЛЬМАНСКАЙ ТРАДЫЦЫІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

**АЎТАРЭФЕРАТ**
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата культуралогіі

па спецыяльнасці 24.00.01 – тэорыя і гісторыя культуры

Мінск, 2021

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навуковая работа выканана на кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў".

Навуковы кіраўнік: **Бондар Юрый Паўлавіч**,
кандыдат палітычных навук, дацэнт,
рэктар Дзяржаўнай установы
адукацыі "Рэспубліканскі
інстытут вышэйшай школы"

Афіцыйныя апаненты: **Марозаў Ігар Вячаслававіч**,
доктар культуралогіі, прафесар,
прафесар кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі
"Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

**Масленчанка Сяргей Валер'евіч**,
кандыдат культуралогіі, дацэнт,
начальнік кафедры філасофіі і ідэалагічнай работы
ўстановы адукацыі "Акадэмія Міністэрства
ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь"

Апаніруючая арганізацыя: **установа адукацыі "Гродзенскі
дзяржаўны ўніверсітэт
імя Янкі Купалы**"

Абарона адбудзецца 27 мая 2021 г. у 16:00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 09.03.01 пры ўстанове адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" па адрасе: 220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17, чытальная зала бібліятэкі; e-mail: byk@buk.by; тэл. вучонага сакратара 375-83-36.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў".

Аўтарэферат разасланы 26 красавіка 2021 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт А. Я. Корсакава

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# УВОДЗІНЫ

Актуальнасць даследавання заключаецца ў тым, што сучасная эпоха характарызуецца ўзаемадзеяннем і ўзаемапранікненнем сусветных цывілізацый, інтэнсіўнымі працэсамі глабалізацыі, глыбокай палітыка-эканамічнай, ідэалагічнай, духоўнай і культурнай інтэграцыяй. У сувязі з гэтым паступова актуалізуюцца пытанні ўзаемасувязі і ўзаемаўплыву паміж рознымі культурамі, ступені і механізмаў уздзеяння адной на другую, іх ролі і месца ў агульнасусветнай этнакультурнай прасторы, што абумоўлівае працэсы ўваходжання этнічных культур у нацыянальную.

Для сучаснай цывілізацыі характэрныя працэсы не толькі палітычнай і эканамічнай інтэграцыі дзяржаў (Еўрапейскі саюз, Еўразійскі эканамічны саюз, Саюз Незалежных Дзяржаў і інш.), але і культурнай. З аднаго боку, гэта абумоўлівае размыванне найперш нацыянальных культур, з другога – узрастанне цікавасці да рэгіянальных сацыякультурных працэсаў. Зараз культура становіцца значным рэсурсам сацыяльна-эканамічнага развіцця, які дазваляе забяспечыць устойлівасць узаемаадносін на дзяржаўным узроўні. Менавіта культура на працягу ўсёй гісторыі назапашвала, захоўвала і перадавала новым пакаленням духоўны вопыт, забяспечвала адзінства шматнацыянальнага народа, выхоўвала пачуцці патрыятызму, талерантнасці і нацыянальнага гонару. Таму найважнейшае значэнне як для знешнепалітычных стратэгій, так і для міжкультурных працэсаў мае культурная інтэграцыя.

Ва ўмовах глабалізацыі сацыяльных сувязяў розных народаў і даступнасці любой інфармацыі ўзаемадзеянне культур становіцца адным з механізмаў, які забяспечвае як паразуменне паміж народамі, так і іх імкненне да захавання самабытнасці і ўнікальнасці менталітэту і культуры. Важнасць разнастайнасці культур адзначана ў Канвенцыі ААН аб ахове і заахвочванні разнастайнасці формаў культурнага самавыяўлення і Усеагульнай дэкларацыі ЮНЕСКА аб культурнай разнастайнасці. Пры гэтым самым рацыянальным варыянтам такога ўзаемадзеяння з'яўляецца інтэграцыя культур, якая забяспечвае стан унутранай цэласнасці, узгодненасці паміж іх рознымі элементамі і патрэбай ва ўзаемадзеянні з іншымі культурамі.

Адзначаныя тэндэнцыі сацыякультурнага развіцця ўласцівыя і для шматнацыянальнай дзяржавы Рэспублікі Беларусь. Гісторыя ўзаемаадносін паміж народамі, якія насяляюць беларускія землі, характарызуецца шматгадовым вопытам сумеснага пражывання, што прывяло да ўзаемапранікнення культурных традыцый. Асаблівае месца ў шматнацыянальнай супольнасці займаюць носьбіты мусульманскай культурнай традыцыі, якія сёння з'яўляюцца неад'емнай часткай беларускага грамадства. Згодна з апошнім перапісам насельніцтва (2019 г.) іслам на тэрыторыі Беларусі вызнаюць каля 27 народаў, што складае больш за 30 000 чалавек (татары, азербайджанцы, туркмены, узбекі, казахі, таджыкі, башкіры, туркі, афганцы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чачэнцы, аварцы, абхазы, кыргызы і інш.). Калі параўнаць колькасць прадстаўнікоў мусульманскай культурнай традыцыі з дадзенымі папярэдніх перапісаў (1999, 2009 гг.), то можна адзначыць павелічэнне колькасці татараў, азербайджанцаў, арабаў, таджыкаў, туркменаў.

Захаванне і развіццё культуры і духоўнасці мусульман з'яўляюцца асабліва важнымі для ажыццяўлення прынцыпаў этнакультурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь, накіраванай на свабоднае развіццё культур усіх нацыянальных супольнасцяў і іх камфортнае суіснаванне ў беларускім талерантным грамадстве. Улічваючы той факт, што з кожным годам узрастае колькасць мігрантаў з мусульманскіх дзяржаў, праблема іх культурнай інтэграцыі актуалізуецца ў сучасным беларускім грамадстве і патрабуе глыбокага культуралагічнага асэнсавання.

Ажыццяўленне комплекснага культуралагічнага даследавання культурнай інтэграцыі сучасных мусульман Беларусі дазваляе выявіць асаблівасці дадзенага працэсу, а менавіта вылучыць асноўныя перыяды і індыкатары культурнай інтэграцыі мусульман, разгледзець у дадзеным кантэксце іх практыку грамадска-культурнай дзейнасці і распрацаваць рэкамендацыі па інтэнсіфікацыі інтэграцыйных працэсаў сярод мусульманскай супольнасці.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з навуковымі праграмамі і тэмамі**

Тэма дысертацыйнай работы адпавядае кірункам 11 "Грамадства і эканоміка" і 13 "Бяспека чалавека, грамадства і дзяржавы" Пераліку прыярытэтных напрамкаў фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў Рэспублікі Беларусь на 2016–2020 гады, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 12 сакавіка 2015 г. № 190.

Дысертацыйнае даследаванне праводзілася ў рамках распрацоўкі комплексных навуковых тэм кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў": "Полімарфізм беларускай культуры як фактар дынамічнага развіцця сучаснага грамадства" (зацверджана на пасяджэнні Савета БДУКМ, пратакол ад 21.12.2010 г., № 4) і "Мецэнацтва як аптымальны механізм узаемадзеяння суб'ектаў культуры беларускага грамадства" (зацверджана на пасяджэнні Савета БДУКМ, пратакол ад 28.10.2015 г., № 3).

**Мэта** дысертацыйнага даследавання – выяўленне асаблівасцяў культурнай інтэграцыі сучасных мусульман на тэрыторыі Беларусі.

Для дасягнення мэты неабходна вырашыць наступныя **задачы**:

- вызначыць культурна-гістарычныя перыяды інтэграцыі мусульман у беларускае грамадства;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- абгрунтаваць сучасную практыку грамадска-культурнай дзейнасці мусульман як паказчык іх паспяховай культурнай інтэграцыі на групавым узроўні;
- вылучыць асноўныя індыкатары культурнай інтэграцыі носьбітаў мусульманскай традыцыі ў Рэспубліцы Беларусь;
- распрацаваць навукова-практычныя рэкамендацыі па інтэнсіфікацыі інтэграцыйных працэсаў сярод сучаснай мусульманскай супольнасці ў Рэспубліцы Беларусь.

**Аб’ект** даследавання – сацыякультурная прастора сучасных мусульман на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

**Прадмет** даследавання – культурная інтэграцыя сучасных мусульман на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў**

У дысертацыйным даследаванні культурная інтэграцыя сучасных мусульман у беларускае грамадства ўпершыню разглядаецца як цэласны працэс. Дысертантам раскрыты кантэкст культурнай інтэграцыі мусульман; вызначаны асноўныя гісторыка-культурныя перыяды дадзенага працэсу і іх асноўныя характарыстыкі; абгрунтавана грамадска-культурная дзейнасць мусульман на сучасным этапе як адзін з паказчыкаў ступені культурнай інтэграцыі на групавым узроўні (на прыкладзе дзейнасці рэлігійных абшчын і рэалізаваных праектаў у сферы культуры і мастацтва); вылучаны асноўныя індыкатары культурнай інтэграцыі носьбітаў мусульманскай традыцыі праз правядзенне апытання яе асобных прадстаўнікоў; распрацавана праграма рэкамендацый па інтэнсіфікацыі інтэграцыйных працэсаў сярод мусульманскай супольнасці ў Рэспубліцы Беларусь.

**Палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону**

**1.** Працэс інтэграцыі мусульман у беларускую культурную прастору адбываецца на працягу больш чым 600 гадоў і падзяляецца на пяць асноўных гісторыка-культурных перыядаў, кожны з якіх адлюстроўвае асаблівасці міжкультурнага ўзаемадзеяння паміж мусульманамі і беларусамі ў пэўны час і мае свае характэрныя рысы: 1. *Вялікакняжацкі перыяд* (пачатак XIV – XVI ст.) насіў пераважна інтэграцыйны характар узаемаадносін паміж мусульманамі і беларусамі. 2. *Перыяд канфедэрацыі* (канец XVI – XVIII ст.) вылучаецца праяўленнем асіміляцыйных змен у культуры мусульман. 3. *Імперскі перыяд* (канец XVIII – пачатак XX ст.) адрозніваецца паглыбленнем асіміляцыйных працэсаў у мусульманскай культуры. 4. *Савецкі перыяд* (1920-я – пачатак 1990-х гг.) характарызуецца крызіснымі з’явамі ў мусульманскай культуры з прычыны панавання ў гэты час атэістычнай ідэалогіі. 5. У *постсавецкі перыяд* (1990-я гг. – пачатак XXI ст.) адбываецца аднаўленне грамадска-культурнай дзейнасці мусульман і развіццё іх культуры на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. У цяперашні час уладамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ажыццяўляецца спрыяльная этнакультурная палітыка ў адносінах да розных супольнасцяў, у тым ліку мусульман.

**2.** Важным паказчыкам паспяховай культурнай інтэграцыі сучасных мусульман у Беларусі з'яўляецца іх актыўная грамадска-культурная дзейнасць *як у рэлігійнай, так і ў свецкай сферах*. Рэлігійныя аб'яднанні выконваюць асноўную функцыю па захаванні культуры і рэлігіі мусульман; умацаванні этнакультурнага адзінства мусульманскіх народаў; падтрымцы і абароне інтарэсаў членаў абшчын. Прыярытэтнымі напрамкамі дзейнасці рэлігійных аб'яднанняў у сферы культуры выступаюць: *адукацыйна-выхаваўчы; рэлігійна-духоўны; навукова-даследчы; выставачны; забаўляльна-арганізацыйны; камунікатыўны; міжнародны* і інш. У цяперашні час беларускія мусульмане арганізоўваюць вялікую колькасць папулярных праектаў у сферы культуры і мастацтва для шырокай аўдыторыі па многіх напрамках: *выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, літаратура, тэатр, кінематограф, адукацыя, музыка*, і ў розных фарматах: *выставы, фестывалі, канцэрты, прэзентацыі, майстар-класы, лекцыі* і інш. Актыўная грамадска-культурная дзейнасць мусульман сведчыць аб іх паспяховай культурнай інтэграцыі на групавым узроўні.

**3.** Культурная інтэграцыя сучасных мусульман прадугледжвае іх адначасовую арыентацыю на *а)* захаванне элементаў роднай культуры; *б)* прыняцце нормаў беларускай культуры. Асноўнымі індыкатарамі дадзенага працэсу з'яўляецца тое, што большасць носьбітаў мусульманскай культурнай традыцыі, якія пастаянна пражываюць у Беларусі, *выконваюць прадпісанні ісламу*; *з'яўляюцца членамі мусульманскіх рэлігійных аб'яднанняў; валодаюць беларускай або рускай мовамі*; *лічаць значным веданне каштоўнасцяў, а таксама выкананне нормаў* жыцця беларускага грамадства; *прымаюць удзел у святкаванні дзяржаўных і традыцыйных святаў Рэспублікі Беларусь*; *зацікаўлены ва ўдзеле ў мерапрыемствах* міжкультурнага напрамку; *маюць вышэйшую адукацыю*, атрыманую ў Беларусі; *працуюць у дзяржаўных і прыватных беларускіх арганізацыях*; *арыентаваны на стратэгію інтэграцыі ў ходзе міжкультурнага ўзаемадзеяння*. Таксама важным індыкатарам інтэграцыі мусульман з'яўляецца пераважна *пазітыўная ацэнка апытанымі як адносін беларусаў да іх супольнасці*, так і *асобасных якасцяў беларусаў*, якія станоўча ўплываюць на міжкультурны дыялог (талерантнасць, верацярпімасць, дружалюбнасць, дабрыня і інш.).

**4.** Далейшая паспяховая культурная інтэграцыя мусульман у беларускае грамадства прадугледжвае ўдасканаленне работы дзяржаўнай сістэмы кіравання па ажыццяўленні прынцыпаў этнакультурнай палітыкі з улікам атрыманых у ходзе дысертацыйнага даследавання вынікаў. Рэкамендацыі па інтэнсіфікацыі інтэграцыйных працэсаў сярод сучаснай мусульманскай супольнасці ў Рэспубліцы Беларусь уключаюць наступныя блокі:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- *палітыка-арганізацыйны* (актывізацыя ролі дзяржавы ў рэалізацыі прынцыпаў этнакультурнай палітыкі і ўключэнне мусульманскай супольнасці ў вырашэнне праблем інтэграцыі);
- *культурна-асветніцкі* (арганізацыя сумесных культурных і асветніцкіх мерапрыемстваў па трансляцыі дасягненняў нацыянальных культур і развіцці этнаканфесійнага дыялогу; курсаў па вывучэнні мусульманамі дзяржаўных моў і інш.);
- *інфармацыйна-забеспячальны* (інфармаванне мусульман аб заканадаўстве, прынцыпах этнакультурнай і міграцыйнай палітыкі Рэспублікі Беларусь, аб сацыяльна-эканамічным і культурным развіцці рэгіёнаў і г. д.);
- *прафілактычны* (падтрымка сумесных формаў узаемадзеяння паміж мусульманамі і беларусамі з падкрэсліваннем агульнага гісторыка-культурнага мінулага і важнага значэння дасягненняў мусульманскай супольнасці для айчыннай культуры; прафілактыка міжнацыянальнай варожасці).

**Асабісты ўклад даследчыка**

Дысертацыйная работа з’яўляецца самастойным навуковым даследаваннем. Праведзены ў рабоце культуралагічны аналіз дазволіў вызначыць асноўныя гісторыка-культурныя перыяды інтэграцыі мусульман у беларускае грамадства і іх характарыстыку. Грамадска-культурная дзейнасць мусульман на прыкладзе дзейнасці рэлігійных абшчын і рэалізаваных праектаў у сферы культуры і мастацтваў абгрунтавана як адзін з паказчыкаў паспяховай культурнай інтэграцыі на групавым узроўні. У выніку праведзенага апытання носьбітаў мусульманскай традыцыі вылучаны асноўныя індыкатары іх культурнай інтэграцыі. На аснове атрыманых у ходзе правядзення апытання вынікаў распрацаваны навукова-практычныя рэкамендацыі па інтэнсіфікацыі інтэграцыйных працэсаў сярод мусульманскай супольнасці.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Асноўныя вынікі і палажэнні даследавання дакладваліся і апрабаваліся аўтарам на 14 навукова-метадычных канферэнцыях міжнароднага і рэспубліканскага ўзроўню: V Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Культура Беларусі: рэаліі сучаснасці: трансфармацыя традыцыйных каштоўнасцей у інфармацыйным грамадстве” (г. Мінск, 27 верасня 2016 г., Інстытут культуры Беларусі); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Сацыяльныя, культурныя і камунікатыўныя практыкі ў дынаміцы грамадскага развіцця” (г. Гродна, 29–30 лістапада 2018 г., Гродзенскі дзярж. ун-т імя Янкі Купалы); XLIII выніковай навуковай канферэнцыі студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў “Нацыянальная культура вачыма маладых” (г. Мінск, 22 сакавіка 2018 г., Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў); Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Дыялагічны дыскурс у культуры XX–XXI стагоддзяў” (г. Кастрама, 26–27 красавіка 2019 г., Кастрамскі дзярж. ун-т); XIII Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вывучэння, успрымання” (г. Мінск, 26–28 красавіка 2019 г., Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў); XLI Міжнародных навуковых чытаннях “Культура народаў Прычарнамор’я з самых старажытных часоў да нашых дзён” (г. Сімферопаль, 24 лістапада 2017 г., Крымскі федэральны ўн-т імя В. І. Вярнадскага); Міжнародным навуковым форуме “Адукацыя. Навука. Культура” (г. Гжэль, 21 лістапада 2018 г., Гжэльскі дзярж. ун-т); XVIII Міжнароднай навукова-практычнай інтэрнэт-канферэнцыі “Гуманітарны прастор навукі: вопыт і перспектывы” (г. Пераяслаў-Хмяльніцкі, 25 чэрвеня 2018 г., Пераяслаў-Хмяльніцкі дзярж. пед. ун-т імя Рыгора Скаварады); Міжнародным навуковым форуме “Адукацыя. Навука. Культура” (г. Гжэль, 20 лістапада 2019 г., Гжэльскі дзярж. ун-т); Міжнародным навуковым форуме “Моладзь у навуцы і творчасці” (г. Гжэль, 8 красавіка 2020 г., Гжэльскі дзярж. ун-т); VII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Сучаснае грамадства: актуальныя праблемы і перспектывы развіцця ў сацыякультурнай прасторы” (Чувашская Рэспубліка, 19 сакавіка 2020 г., Чувашскі дзярж. інстытут культуры і мастацтваў); XIV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Рэлігія і грамадства” (г. Магілёў, 6–11 красавіка 2020 г., Магілёўскі дзярж. ун-т імя А. А. Куляшова); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Культура. Навука. Творчасць”, прысвечанай 75-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне (г. Мінск, 14 мая 2020 г., Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў); II Міжнародным навуковым кангрэсе беларускай культуры (г. Мінск, 10 верасня 2020 г., Нацыянальная акадэмія навук Беларусі).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Матэрыялы дысертацыйнага даследавання знайшлі адлюстраванне ў 14 публікацыях аўтара, у тым ліку ў 5 артыкулах у рэцэнзуемых выданнях, рэкамендаваных ВАК Рэспублікі Беларусь; у 7 артыкулах у навуковых зборніках; матэрыялах 2 канферэнцый. Агульны аб’ём публікацый складае 4,5 арк., з якіх 2 арк. апублікаваны ў выданнях, уключаных у Пералік навуковых выданняў ВАК Рэспублікі Беларусь.

**Структура і аб’ём дысертацыі**

Дысертацыйнае даследаванне складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў (уключаюць 8 раздзелаў), заключэння, бібліяграфічнага спісу, дадатку. Поўны аб’ём дысертацыі складае 153 старонкі, з іх 115 займае асноўны тэкст, 20 старонак – бібліяграфічны спіс, які складаецца са спісу выкарыстаных крыніц (215 найменняў на рускай, польскай, беларускай і англійскай мовах) і спісу публікацый аўтара (14 найменняў на беларускай і рускай мовах), дадатак займае 18 старонак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

**Ва ўводзінах і агульнай характарыстыцы работы** аргументаваны выбар тэмы даследавання, раскрыты яе актуальнасць і навуковая навізна; абгрунтоўваецца сувязь работы з навуковымі праграмамі і тэмамі; ставяцца мэта і задачы дысертацыйнага даследавання; сфармуляваны асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону; вызначаецца асабісты ўклад саіскальніка і адлюстроўваюцца звесткі пра апрабацыю вынікаў даследавання, іх апублікаванасць, а таксама пра структуру і аб'ём дысертацыі.

**У главе 1 "Тэарэтыка-метадалагічныя асновы даследавання"** праведзены аналіз літаратуры па праблеме культурнай інтэграцыі носьбітаў мусульманскай традыцыі ў Беларусі; выкладаецца метадалогія дысертацыйнага даследавання.

***У раздзеле 1.1 "Аналітычны агляд літаратуры"*** аналізуюцца розныя падыходы да вывучэння культурнай інтэграцыі і разглядаюцца асноўныя даследаванні гісторыі і культуры беларускіх мусульман.

Праблеме культурнай інтэграцыі прысвечаны шэраг прац замежных і айчынных культуролагаў (М. С. Кагана, Б. А. Маліноўскага, Ю. М. Саланіна, П. А. Сарокіна, А. І. Смоліка і інш.), антраполагаў (Р. Бенедыкт), сацыёлагаў (І. Гофмана і А. Шуца), філосафаў (У. М. Шавялёва) і іншых. У дадзеным дысертацыйным даследаванні пад *культурнай інтэграцыяй носьбітаў мусульманскай традыцыі адначасова разумеецца шматмерны працэс і вынік прыняцця мусульманамі нормаў беларускай культуры пры ўмове захавання імі элементаў роднай культуры.*

Даследаваннем гісторыі і культуры мусульман у Беларусі займаліся І. Б. Канапацкі, З. І. Канапацкая, У. А. Ліхадзедаў, А. І. Смолік. Культуры татараў у побытавым, гаспадарчым і рэлігійным аспектах у перыяд з XIV да пачатку XX ст. прысвечаны працы С. Крычынскага. Даследаванні мусульманскіх мячэцяў на беларускіх землях асвятляюцца ў працах З. І. Канапацкай, А. І. Лакоткі, А. І. Смоліка. Праблемамі мусульманскай адукацыі, выхавання, далучэння дзяцей да гісторыі і культуры свайго этнасу ў сучаснай Беларусі займаліся І. Герасімава, С. У. Грыбава і інш. Дзейнасці грамадска-культурных аб'яднанняў татараў у Беларусі прысвечаны працы А. М. Вабішчэвіча і В. В. Шэйбак. Значны ўклад татараў-мусульман Беларусі ў час Вялікай Айчыннай вайны адзначаюць у сваіх працах С. У. Грыбава, З. І. Канапацкая, Л. І. Копач. Сацыялагічны аспект інтэграцыі мігрантаў-мусульман даследаваў беларускі сацыёлаг А. А. Алампіеў. Рукапісныя кнігі татараў Беларусі як крыніцы для вывучэння мусульманскай духоўнай культуры даследуюць У. П. Дзямідчык, А. І. Жураўскі, М. У. Тарэлка, А. І. Цітавец і інш. У ходзе аналізу літаратуры па праблеме даследавання была выяўлена неабходнасць ажыццяўлення комплекснага культуралагічнага вывучэння асаблівасцяў культурнай інтэграцыі сучасных мусульман у культурную прастору Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***У раздзеле 1.2 “Метадалогія і метады даследавання”*** раскрываюцца асноўныя падыходы і абгрунтоўваюцца выкарыстаныя ў даследаванні метады.

Метадалогія дысертацыйнага даследавання грунтуецца на канцэпцыі *культурнага рэлятывізму* (прызнанне кожнай асобнай культуры як унікальнай сістэмы каштоўнасцяў (Р. Бенедыкт, Ф. Боас, А. Кробер, М. Херсковіц і інш.) і *мультыкультуралізму* (палітыка падтрымання этнакультурнай разнастайнасці ў адзіным грамадстве (С. Бенхабіб, У. Джэймс, Ч. Пірс, Ч. Тэйлар). У ходзе даследавання выкарыстоўваўся комплексны падыход, а менавіта: *сістэмны,* згодна з якім культурная інтэграцыя мусульман разглядаецца намі як сістэма ўзаемадзеючых аб’ектаў (суб’ектаў культурнай інтэграцыі – асобных носьбітаў мусульманскай традыцыі; мусульманскай супольнасці; беларускага грамадства) (Дж. Бэры, Д. Сэм, К. Уорд); *дзейнасны падыход*, паводле якога асоба носьбіта мусульманскай культурнай традыцыі разглядаецца намі як суб’ект і аб’ект культуры, станаўленне яе адбываецца ў ходзе ажыццяўлення практычнай дзейнасці (Б. А. Маліноўскі, В. М. Мяжуеў).

Для вырашэння задач, пастаўленых у рабоце, былі выкарыстаны наступныя навуковыя метады даследавання: *метад тэарэтычнай рэканструкцыі* быў ужыты для высвятлення сутнасці культурнай інтэграцыі (раздзел 1.1); *дыяхранічны і сінхранічны метады даследавання* дазволілі разгледзець асаблівасці міжкультурных адносін паміж беларусамі і мусульманамі ў гістарычным кантэксце, вылучыць пяць асноўных перыядаў культурнай інтэграцыі мусульман у беларускую культурную прастору і ахарактарызаваць іх (раздзел 2.1); *метад узыходжання ад абстрактнага да канкрэтнага* даў магчымасць разгледзець асноўныя прынцыпы этнакультурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе і іх рэалізацыю ў адносінах да мусульманскай супольнасці (раздзел 2.2); *структурна-функцыянальны метад* дазволіў больш дэтальна разгледзець культуру мусульман і яе асноўныя элементы, выявіць іх функцыянальную значнасць, растлумачыць іх значэнне і ступень уплыву на працэс культурнай інтэграцыі (раздзел 3.1); *метад уключанага назірання* выкарыстоўваўся падчас збору эмпірычнай інфармацыі ў палявых умовах і правядзення масавых мерапрыемстваў для супастаўлення атрыманай ад мусульман інфармацыі з рэальным становішчам, праверкі яе на дакладнасць, а таксама вылучэння і апісання аб’екта даследавання, раскрыцця яго асноўных рыс і прыкмет (раздзел 3.1, раздзел 3.2, раздзел 4.1); *метад глыбіннага інтэрв’ю* выкарыстоўваўся для выяўлення перакананняў, каштоўнасцяў і матывацыі рэспандэнтаў у кантэксце іх грамадска-культурнай дзейнасці (раздзел 3.1); *метад якаснага кантэнт-аналізу* ўжываўся пры разглядзе сэнсавага зместу інтэрнэт-крыніц з мэтай выяўлення ступені актыўнасці адлюстравання вынікаў грамадска-культурнай дзейнасці сучасных мусульман Беларусі ў СМІ (раздзел 3.2); *метад анкетавання* выкарыстоўваўся для вылучэння асноўных індыкатараў паспяховай культурнай інтэграцыі сучасных мусульман (раздзел 4.1); *праектны метад* дазволіў распрацаваць комплекс

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэкамендацый па інтэнсіфікацыі інтэграцыйных працэсаў сярод мусульманскай супольнасці ў Беларусі (раздзел 4.2).

**У главе 2 “Кантэкст культурнай інтэграцыі мусульман у беларускае грамадства”** адносіны паміж мусульманамі і беларусамі разглядаюцца ў гістарычнай перспектыве; вылучаюцца асноўныя перыяды культурнай інтэграцыі мусульман у беларускае грамадства, даецца іх характарыстыка; аналізуецца ступень рэалізацыі этнакультурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь у адносінах да мусульманскай супольнасці.

***У раздзеле 2.1 “Культурна-гістарычныя перыяды інтэграцыі мусульман у Беларусі”*** вызначаюцца асноўныя перыяды культурнай інтэграцыі мусульман паводле прынцыпу ўваходжання тэрыторыі Беларусі ў розныя дзяржаўныя ўтварэнні з асаблівымі прынцыпамі этнакультурнай палітыкі ў адносінах да мусульман з моманту іх першага паяўлення на беларускіх землях у XIV ст.

*Вялікакняжацкі перыяд* (пачатак XIV – XVI ст.) быў адным з самых спрыяльных для паспяховага ўваходжання мусульман у беларускую сацыякультурную прастору. У гэты час назіраецца значная падтрымка татараў з боку дзяржавы ў прававой, грамадскай і культурнай сферах. Татары-мусульмане актыўна захоўвалі сваю культуру, веравызнанне, традыцыі, абрады; карысталіся ўласнай мовай. Пачынаецца будаўніцтва мячэцяў у Некрашунцах пад Лідай, у Лоўчыцах пад Навагрудкам.

У *перыяд канфедэрацыі* (канец XVI – XVIII ст.) пачынаюць адбывацца паступовыя змены ў моўнай і рэлігійнай культуры з асіміляцыйнымі прыкметамі. Напрыклад, з’яўляюцца “Кітабы”, якія ўяўляюць сабой рэлігійныя тэксты мусульман на старабеларускай мове.

Падчас *імперскага перыяду (*канец XVIII – пачатак XX ст.) назіраецца паглыбленне ўплыву беларускай культуры на мусульман, якія ўсё часцей выкарыстоўвалі беларускую мову, уступалі ў манагамныя і нават у змешаныя шлюбы. Працягвалася будаўніцтва мячэцяў на сродкі членаў рэлігійных абшчын. Адбывалася ўзмацненне ролі абшчыны-умы ў захаванні культуры мусульман.

Падчас *савецкага перыяду* (1920-я – пачатак 1990-х гг.) панаванне атэістычнай ідэалогіі негатыўным чынам паўплывала на рэлігійную культуру мусульман: разбураліся мячэці (пасля вайны засталася толькі адна ў г. п. Іўе Гродзенскай вобласці); закрываліся мусульманскія школы; арыштоўваліся мусульманскія духоўныя асобы, прадстаўнікі татарскай інтэлігенцыі; скарачалася колькасць мусульманскага насельніцтва і г. д. Але падчас Другой сусветнай вайны татары ўнеслі істотны ўклад у агульную перамогу. Сярод абаронцаў беларускіх зямель значацца наступныя імёны: Х. А. Шабановіч, Г. Рафаловіч і С. Рафаловіч, Я. М. Радлінскі, М. Б. Радкевіч, С. С. Сафарэвіч, Х. А. Якубоўскі і Я. А. Якубоўскі, Я. А. Хасіневіч і А. А. Хасіневіч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аднак мусульмане, якія з 1921 і па 1939 г. апынуліся на тэрыторыі Польшчы, мелі магчымасць адраджаць сваю культуру і займацца грамадскай дзейнасцю. У гэты час былі створаны Мусульманскае рэлігійнае аб’яднанне (1925), Культурна-асветніцкае аб’яднанне татараў Польшчы (1926); выдаваліся “Татарскі штогоднік”, часопіс “Татарскае жыццё”, “Ісламскі агляд” і інш.; былі адкрыты Татарскі нацыянальны музей і татарскі архіў.

У *постсавецкі перыяд* (1990-я гг. – пачатак XXI ст.) мусульманская традыцыя ў Беларусі пачынае адраджацца, што звязана з утварэннем незалежнай дзяржавы са спрыяльнай прававой базай для развіцця культуры нацыянальных меншасцяў. Ствараліся першыя грамадска-культурныя аб’яднанні мусульман (Беларускае згуртаванне татараў-мусульман “Аль-Кітаб”) і нядзельныя школы ў розных населеных пунктах краіны. Пачалося выданне першага друкаванага часопіса беларускіх татараў на беларускай мове (квартальны часопіс “Байрам”). Аднаўляюць дзейнасць мячэці ў Слоніме, Мінску, Навагрудку, Смілавічах, Клецку, Лоўчыцах, Маладзечне і грамадска-культурныя суполкі ў месцах кампактнага пражывання мусульман у буйных гарадах (“Дыялог Еўразіі”, “Габустан”,“Елімай”, “Атал”, “Ачаг” і інш.).

***У раздзеле 2.2 “Сучасная этнакультурная палітыка Рэспублікі Беларусь у адносінах да мусульманскай супольнасці”*** аналізуюцца асноўныя прынцыпы і напрамкі дзяржаўнай этнакультурнай палітыкі і яе рэалізацыя ў адносінах да мусульманскай супольнасці. Згодна з яе асноўнымі прынцыпамі мусульмане маюць права захоўваць і развіваць сваю нацыянальную культуру, выхоўваць дзяцей у нацыянальных культурных традыцыях, карыстацца роднай мовай, ствараць рэлігійныя аб’яднанні і навучальныя ўстановы для захавання сваёй гісторыі і культуры, этнічнай самасвядомасці і самабытнасці. Зараз на тэрыторыі Беларусі дзейнічаюць: “Мусульманскае рэлігійнае аб’яднанне мусульман” і Міжнародны фонд развіцця татара-башкірскай духоўнай спадчыны “Чышма” ў г. Мінску; аб’яднанне чувашоў “Атал” у г. Гродна; аб’яднанні азербайджанцаў “Азербайджанская абшчына “Азеры” (г. Магілёў) і “Габустан” (г. Мінск) і інш.; дагестанцаў – “Ачаг” і “Гора” (г. Мінск); сірыйцаў – “Сірыйская абшчына” (г. Мінск); афганцаў – “Афганская абшчына” (г. Мінск); казахаў – “Елімай” (г. Мінск); туркменаў – “Бахар” (г. Мінск). Дзяржаўная падтрымка ажыццяўляецца праз дзейнасць пры Міністэрстве культуры Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур, у якой актыўны ўдзел прымаюць мусульманскія суполкі. На базе дзяржаўных устаноў культуры і адукацыі і пры грамадскіх аб’яднаннях нацыянальных супольнасцяў і рэлігійных абшчынах у краіне функцыянуюць адукацыйныя мусульманскія арганізацыі ў форме гурткоў і школ выхаднога дня (Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі “Эўрыка” для афганскіх дзяцей, школа выхаднога дня пры Міжнародным грамадскім аб’яднанні (“Палесцінская абшчына”) і пры Пасольстве Рэспублікі Казахстан у Рэспубліцы Беларусь і інш.). Арганізуюцца мусульманскія летнія лагеры ў Іўі, Навагрудку, Мінску. Дзяржава

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

садзейнічае будаўніцтву і захаванню мячэцяў у Слоніме, Навагрудку, Смілавічах, Відзах, Клецку, Лоўчыцах, Маладзечне, Іўі, Мінску. Таксама дзяржава забяспечвае інфармацыйную падтрымку праз друкаваныя СМІ (газеты “Голас Радзімы”, “Культура”, “Беларусь Сёння”, “Рэспубліка”, часопіс “Мастацтва” і г. д.); беларускае тэлебачанне (праграмы “Шматгалоссе: народы Беларусі: гісторыя, культура, побыт”, “Супольнасць”, “Нацыянальная палітра”, “Братэрства” і інш.); у інтэрнэце (групы ў сацыяльных сетках “Іслам у Беларусі”, “Мусульмане Беларусі”, “Беларускія татары – нашчадкі Залатой Арды”, сайт “Іслам.бай” і інш.). Існуюць перыядычныя выданні мусульманскіх супольнасцяў (“Байрам”, “Жыццё”, “Аль-Іслам” – татарскія, “Габустан” – азербайджанскае, “Садай Афган” – афганскае і інш.).

**У главе 3 “Практыка грамадска-культурнай дзейнасці беларускіх мусульман на сучасным этапе”** разглядаецца дзейнасць мусульманскіх абшчын і рэлігійных аб’яднанняў, носьбітаў ісламскай традыцыі, і аналізуецца сучасная практыка іх праектнай дзейнасці ў сферы культуры і мастацтва ў кантэксце культурнай інтэграцыі.

***У раздзеле 3.1 “Дзейнасць мусульманскіх абшчын і рэлігійных аб’яднанняў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь”*** вылучаюцца функцыі і асноўныя напрамкі дзейнасці афіцыйна зарэгістраваных у краіне мусульманскіх рэлігійных аб’яднанняў. Рэлігійныя аб’яднанні дапамагаюць мусульманам захоўваць сваю рэлігійную культуру і перадаваць яе маладому пакаленню, тым самым мінімізаваць магчымасць поўнай асіміляцыі пад уплывам беларускай культуры і забяспечыць ажыццяўленне менавіта культурнай інтэграцыі. У Рэспубліцы Беларусь афіцыйна зарэгістраваны 24 мусульманскія абшчыны (2 – у Брэсцкай вобласці; 4 – у Віцебскай вобласці; 1 – у Гомельскай вобласці; 7 – у Гродзенскай вобласці; 1 – у Магілёўскай вобласці; 6 – у Мінскай вобласці і 3 – у г. Мінску). Большасць абшчын уваходзяць у склад рэспубліканскіх рэлігійных аб’яднанняў: “Мусульманскае рэлігійнае аб’яднанне ў Рэспубліцы Беларусь” і “Духоўнае ўпраўленне мусульман у Рэспубліцы Беларусь”. Дзве абшчыны маюць аўтаномны статус: мусульманская рэлігійная абшчына ў Гродне і рэлігійная абшчына “Ахл аль-Бейт” у Мінску. Іх дзейнасць накіравана на ўмацаванне этнакультурнага адзінства мусульманскіх народаў, іх далейшае культурнае і сацыяльнае развіццё ў межах нашай краіны. Прыярытэтнымі напрамкамі дзейнасці дадзеных рэлігійных аб’яднанняў з’яўляюцца адукацыя і выхаванне дзяцей і моладзі, іх рэлігійна-духоўнае развіццё, арганізацыя забаўляльных мерапрыемстваў па розных напрамках. У мусульманскіх арганізацыях ажыццяўляецца навукова-даследчая дзейнасць, забеспячэнне міжнароднага супрацоўніцтва, прэзентацыя і папулярызацыя мусульманскай культуры праз рэалізацыю выставачных праектаў.

***У раздзеле 3.2 “Праектная дзейнасць мусульман у сферы культуры і мастацтваў на тэрыторыі Беларусі”*** разглядаюцца асноўныя сумесныя праекты, накіраваныя на трансляцыю дасягненняў нацыянальных культур і ўзмацненне міжкультурных сувязяў. Ажыццяўленне сумеснай грамадска-культурнай дзейнасці

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

мусульман і беларусаў адлюстроўвае накіраванасць носьбітаў мусульманскай традыцыі менавіта на прадуктыўнае ўзаемадзеянне з групай большасці, што адначасова з’яўляецца паказчыкам паспяховай культурнай інтэграцыі.

Найбольш значнымі ў дадзеным напрамку з’яўляюцца *Усебеларускі фестываль нацыянальных культур у г. Гродна, фестывалі “Яднанне” і “Узор” у г. Мінску*. У краіне рэгулярна праводзяцца *Дні мусульманскіх культур* (іранскай, казахстанскай, азербайджанскай, палесцінскай і інш.). Арганізуюцца мерапрыемствы ў сферах выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, літаратуры, тэатра, кінематографа, адукацыі, музыкі і г. д., накіраваныя на захаванне, папулярызацыю і абнаўленне культурных традыцый у працэсе сістэмнай перадачы нарматыўна-каштоўнаснага вопыту чалавецтва, на задавальненне патрэбы асобы ў самарэалізацыі ва ўсіх відах культуратворчай дзейнасці, на азнаямленне сусветнай грамадскасці са шматнацыянальнай культурай Беларусі. Асноўнымі пляцоўкамі для міжкультурнай дзейнасці па дадзеных напрамках з’яўляюцца *Беларускае таварыства дружбы і культурных сувязяў з замежнымі краінамі, Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур, мастацкая галерэя “Універсітэт культуры”* і інш. Праектная дзейнасць мусульман у сферы культуры і мастацтваў, маштаб і ўзровень арганізацыі такіх мерапрыемстваў сведчаць аб паспяховай культурнай інтэграцыі мусульман у беларускае грамадства.

**У главе 4 “Сучасны стан і перспектывы культурнай інтэграцыі мусульман у Беларусі”** прадстаўлены вынікі анкетавання носьбітаў мусульманскай традыцыі, вылучаны асноўныя індыкатары культурнай інтэграцыі мусульман; распрацаваны рэкамендацыі па актывізацыі працэсу ўваходжання мусульман у беларускую культуру.

***У раздзеле 4.1 “Індыкатары культурнай інтэграцыі носьбітаў мусульманскай традыцыі ў Беларусі”*** пры дапамозе метаду анкетавання раскрываецца сутнасць інтэграцыйных працэсаў сучаснай мусульманскай супольнасці. Аўтарам была распрацавана анкета, якая змяшчае 27 пытанняў аб рэлігійнай прыналежнасці, узроўні валодання мовай, узроўні адукацыі, якасці інфармацыйнага забеспячэння, узаемаадносінах з мясцовым насельніцтвам і інш. Усяго ў апытанні прынялі ўдзел 262 мусульманіны. Яно праводзілася ў канцы 2019 – пачатку 2020 г. сярод прадстаўнікоў мусульманскай супольнасці Рэспублікі Беларусь ва ўзросце ад 18 гадоў і старэй. Выбарка рэспандэнтаў ажыццяўлялася з выкарыстаннем *метаду “снежнага кому”*: кожны апытаны мусульманін рэкамендаваў да ўдзелу ў даследаванні сваіх сяброў, калег, знаёмых, якія падыходзілі б пад умовы адбору. Гэта методыка дазволіла значна скараціць час пошуку інфармантаў і заваявання іх даверу. Сярод асноўных індыкатараў паспяховай культурнай інтэграцыі мусульман былі вылучаны: выкананне прадпісанняў ісламу; уваходжанне ў мусульманскія рэлігійныя аб’яднанні; валоданне беларускай або рускай мовамі; веданне каштоўнасцяў і выкананне нормаў жыцця беларускага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грамадства; удзел у святкаванні дзяржаўных і традыцыйных свят Рэспублікі Беларусь; наяўнасць вышэйшай адукацыі, атрыманай у Беларусі; арыентацыя на стратэгію інтэграцыі ў ходзе міжкультурнага ўзаемадзеяння; пераважна пазітыўная ацэнка апытанымі адносін беларусаў да групы меншасці і іх асобасных якасцяў і інш.

У выніку даследавання былі высветлены некаторыя праблемныя аспекты ўзаемадзеяння мусульман і беларусаў, што ў асобных выпадках могуць стаць патэнцыяльнымі перашкодамі для паспяховай культурнай інтэграцыі мусульман, якія пражываюць у Беларусі, а таксама тых, хто прыбудзе ў будучым. Палова апытаных ацанілі ўзровень этнакультурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь як сярэдні; адзначылі большую задаволенасць інфармацыйным забеспячэннем менавіта ў інтэрнэце, а не ў традыцыйных СМІ; прадэманстравалі рост зацікаўленасці ў новых культурных мерапрыемствах. Усё гэта патрабуе павышанай увагі з боку дзяржаўных органаў кіравання для эфектыўнага ажыццяўлення прынцыпаў этнакультурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь і інтэнсіфікацыі інтэграцыйных працэсаў сярод мусульманскай супольнасці.

***У раздзеле 4.2 “Рэкамендацыі па інтэнсіфікацыі інтэграцыйных працэсаў сярод сучаснай мусульманскай супольнасці”*** з улікам вылучаных асаблівасцяў уваходжання мусульман у айчынную культуру аўтарам былі распрацаваны рэкамендацыі па ўдасканаленні сістэмы рэгулявання дзяржавай інтэграцыйных працэсаў сярод мусульманскай супольнасці. Дадзеныя рэкамендацыі ўключаюць наступныя блокі:

– *палітыка-арганізацыйны* (па папулярызацыі прынцыпаў этнакультурнай палітыкі сярод мусульман і прыцягненні іх да вырашэння праблем інтэграцыі; па аказанні падтрымкі ісламскім суполкам і аб’яднанням, фарміраванні ўмоў для іх умацавання і мадэрнізацыі (напрыклад, па падрыхтоўцы рэлігійных кадраў у Рэспубліцы Беларусь); па правядзенні грамадскіх мерапрыемстваў міжкультурнай накіраванасці і інш.);

– *культурна-асветніцкі* (арганізацыя мерапрыемстваў, накіраваных на трансляцыю дасягненняў нацыянальных культур і стварэнне ўмоў для ажыццяўлення міжкультурнага дыялогу; арганізацыя праграм стажыровак, навучальных трэнінгаў для моладзі, якія б аб’ядноўвалі выхадцаў з мусульманскіх абшчын і карэнных беларусаў; правядзенне сумесных канферэнцый; садзеянне развіццю арганізацый мусульманскай асветы і інш.);

– *інфармацыйна-забеспячальны* (рэгулярнае інфармаванне мусульман аб палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным развіцці краіны, аб мерах па рэалізацыі міграцыйнай палітыкі Рэспублікі Беларусь і дзейнасці органаў улады ў сферы інтэграцыі, аб заканадаўстве Рэспублікі Беларусь у частцы прававога становішча, міграцыйнага ўліку, працаўладкавання, знаходжання і пражывання, магчымасцях набыцця грамадзянства і інш.);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– *прафілактычны* (падтрымка талерантнасці і салідарнасці паміж мусульманамі і мясцовым насельніцтвам; арганізацыя мерапрыемстваў па дэманстрацыі агульных этыка-светапоглядных нормаў ісламу і іншых рэлігій; трансляцыя культурных дасягненняў мусульман і тлумачэнне іх значэння для беларускай культуры і грамадства; інстытуцыянальная падтрымка сумесных формаў узаемадзеяння, талерантнасці і салідарнасці паміж мусульманамі і беларусамі і г. д.).

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

**Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі**

**1.** Зыходзячы з прынцыпу ўваходжання тэрыторыі Беларусі ў розныя дзяржаўныя ўтварэнні з адпаведнай этнакультурнай палітыкай у адносінах да мусульман з моманту паяўлення на ёй першых мусульманскіх абшчын, намі было вылучана пяць асноўных гісторыка-культурных перыядаў інтэграцыі мусульман у беларускае грамадства: *вялікакняжацкі* (пачатак XIV – XVI ст.), *перыяд канфедэрацыі* (канец XVI – XVIII ст.), *імперскі* (канец XVIII – пачатак XX ст.), *савецкі* (1920-я – пачатак 1990-х гг.), *постсавецкі* (1990-я гг. – пачатак XXI ст.). Кожны з гэтых перыядаў адлюстроўвае асаблівасці працэсу ўваходжання мусульман у беларускае грамадства і мае свае характэрныя рысы.

*Вялікакняжацкі перыяд* характарызуецца аказаннем значнай прававой падтрымкі татарам з боку дзяржавы; прадастаўленнем магчымасцяў для захавання татарамі сваёй культуры і рэлігіі, выкарыстання сваёй мовы, адкрыцця малітоўных дамоў, будаўніцтва мячэцяў і г. д. Дадзены перыяд стаў спрыяльным для далейшай інтэграцыі мусульман у беларускае грамадства. У *перыяд канфедэрацыі* адбывалася інтэнсіфікацыя культурнай інтэграцыі мусульман, усталяванне іх сацыяльна-прававога становішча ў грамадстве. У дадзены перыяд сярод мусульманскай супольнасці назіраліся адметныя культурныя змены ў мове (значны ўплыў аказала старабеларуская мова) і рэлігіі (з’яўленне “Кітабаў” – рэлігійных тэкстаў мусульман на старабеларускай мове), што насіла прыкметы асіміляцыі. *Імперскі перыяд* характарызуецца паглыбленнем асіміляцыйных працэсаў праз павелічэнне колькасці манагамных змешаных шлюбаў, выкарыстанне беларускай мовы і запазычанне абрадаў. Мусульманская культура пераважным чынам захоўвалася дзякуючы функцыянаванню абшчыны-умы. Падчас с*авецкага перыяду* назіраецца разбурэнне культурнай прасторы беларускіх мусульман: адбываецца закрыццё мячэцяў пасля вайны (засталася толькі ў Іўі); татарскія медрэсэ існавалі нелегальна; адзначалася скарачэнне татарскага насельніцтва. Аднак на беларускіх землях, што ўвайшлі ў склад Польшчы (з 1921 па 1939 г.), адбывалася адраджэнне культуры татарскага народа, стварэнне рэлігійных і культурна-асветніцкіх аб’яднанняў, выданне часопісаў, падручнікаў, назіралася кансалідацыя мусульманскай супольнасці, у той час як жыццё мусульман на тэрыторыі БССР праходзіла ў кантэксце ўсталявання

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

савецкімі ўладамі атэістычнай ідэалогіі. *Постсавецкі перыяд* вызначаецца аднаўленнем мусульманскай традыцыі дзякуючы моцнай прававой падтрымцы нацыянальных і рэлігійных меншасцяў, стварэнню мусульманскіх грамадска-культурных аб'яднанняў і нядзельных школ для мусульман, аднаўленню дзейнасці мячэцяў, выдавецтваў, мусульманскіх грамадска-культурных суполак і г. д. Сучасны перыяд характарызуецца ажыццяўленнем спрыяльнай для культурнай інтэграцыі мусульман дзяржаўнай этнакультурнай палітыкі, якая рэалізуецца ў адпаведнасці з прынцыпам свабоднага развіцця культур усіх нацыянальных супольнасцяў. Адсутнасць ярка выяўленых супярэчнасцяў і канфліктаў паміж беларускай і мусульманскай супольнасцямі звязана са складаннем пераважна станоўчых для культурнай інтэграцыі ўмоў жыцця мусульман на беларускіх землях [1; 2; 3; 6; 7; 10; 13; 14].

**2.** Важным паказчыкам ступені культурнай інтэграцыі сучасных мусульман з'яўляецца практыка іх грамадска-культурнай дзейнасці ў Беларусі. Захаванне культуры і рэлігіі мусульман, умацаванне этнакультурнага адзінства мусульманскіх народаў, іх далейшае культурнае і сацыяльнае развіццё ў межах нашай краіны пераважна адбываюцца праз дзейнасць рэлігійных аб'яднанняў. Усяго на тэрыторыі краіны налічваецца 24 мусульманскія рэлігійныя абшчыны ў розных рэгіёнах, амаль усе яны ўваходзяць у склад рэспубліканскіх рэлігійных аб'яднанняў. Мусульманская абшчына з'яўляецца асноўным колам зносін паміж яе членамі. Праз дзейнасць згаданых арганізацый ажыццяўляюцца захаваннне і перадача рэлігіі, традыцый, нормаў паводзін; падтрымка і абарона інтарэсаў прадстаўнікоў мусульманскіх абшчын; развіццё супрацоўніцтва з іншымі рэлігійнымі і нацыянальна-культурнымі аб'яднаннямі; захаванне мусульманскіх сямейных каштоўнасцяў; праца з моладдзю па выхаванні талерантнасці. Такім чынам, прыярытэтнымі напрамкамі дзейнасці дадзеных рэлігійных аб'яднанняў з'яўляюцца: адукацыйна-выхаваўчы; рэлігійна-духоўны; навукова-даследчы; выставачны; забаўляльны; інфармацыйны, а таксама міжнароднае супрацоўніцтва і ўдзел у міжнародных, рэспубліканскіх і рэгіянальных мерапрыемствах. Іх дзейнасць ажыццяўляецца ў асноўным у наступных формах: этнакультурныя мерапрыемствы, праекты, семінары; публікацыі ў СМІ; стварэнне ўласных сайтаў, груп у сацыяльных сетках; вывучэнне арабскай мовы; арганізацыя сустрэч з прадстаўнікамі абшчын; правядзенне рэгулярных заняткаў па вывучэнні асноў ісламу; удзел у сацыякультурнай дзейнасці абшчыны; арганізацыя моладзевых лагераў на базе мячэцяў.

Праектная дзейнасць мусульманскіх суполак у сферы культуры і мастацтва ў Беларусі – таксама адзін з важных паказчыкаў культурнай інтэграцыі носьбітаў ісламскай традыцыі ў беларускае грамадства. У цяперашні час назіраецца вялікая колькасць сумесных мерапрыемстваў, найбольш значнымі з іх з'яўляюцца Усебеларускі фестываль нацыянальных культур, фестывалі “Яднанне” і “Узор”. Традыцыйнымі сталі Дні мусульманскіх культур, напрыклад, Ірана, Казахстана,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Азербайджана і іншых краін. Сумесныя праекты рэалізуюцца па многіх напрамках (выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, літаратура, тэатр, кінематограф, адукацыя, музыка) і ў розных фарматах (выставы, фестывалі, канцэрты, прэзентацыі, майстар-класы, лекцыі і інш.). Рэалізацыя сумесных праектаў у сферы культуры і мастацтваў дазваляе ўзмацняць міжкультурныя сувязі, трансляваць дасягненні нацыянальных культур на шырокую аўдыторыю рэцыпіентных і дамінуючай груп. Колькасць, маштаб, узровень арганізацыі такіх мерапрыемстваў у сукупнасці са шчырай зацікаўленасцю і станоўчымі водгукамі наведвальнікаў сведчаць аб паспяховай культурнай інтэграцыі мусульман у беларускае грамадства [5; 9].

**3.** Ацэнка культурнай інтэграцыі сучасных мусульман прадугледжвае даследаванне арыентацыі асобных прадстаўнікоў мусульманскай культурнай традыцыі на *а)* захаванне роднай культуры і *б)* узаемадзеянне з членамі беларускага грамадства і засваенне беларускай культуры праз правядзенне анкетнага апытання. Усяго ў даследаванні прынялі ўдзел 262 прадстаўнікі ісламскай культурнай традыцыі ва ўзросце ад 18 гадоў і старэй, як мужчынскага (66,8% – 175 рэспандэнтаў), так і жаночага полу (33,2% – 87 рэспандэнтаў). У выніку даследавання былі вылучаны асноўныя індыкатары культурнай інтэграцыі мусульман: *выкананне прадпісанняў ісламу* (больш за 70% апытаных); *уваходжанне ў мусульманскія рэлігійныя аб'яднанні* (каля 71 % апытаных); *валоданне беларускай або рускай мовамі* (больш за 85%); *веданне каштоўнасцяў і выкананне нормаў жыцця беларускага грамадства* (каля 83% апытаных); *удзел у святкаванні дзяржаўных і традыцыйных святаў Рэспублікі Беларусь* (больш за 90%); *зацікаўленасць ва ўдзеле ў мерапрыемствах* міжкультурнага напрамку (каля 73% апытаных, прычым перавага аддавалася Дням нацыянальных культур (21,7%), канцэртам (15,2%), фестывалям (10,7%), выставам (8,1%), кірмашам (6,6%), семінарам (4,9%) і г. д.); *наяўнасць вышэйшай адукацыі*, атрыманай у Беларусі (каля 47% апытаных); *праца ў дзяржаўных і прыватных арганізацыях Рэспублікі Бела*русь (каля 90%); *арыентацыя на стратэгію інтэграцыі ў ходзе міжкультурнага ўзаемадзеяння* (70,2% апытаных). Таксама важным індыкатарам паспяховай культурнай інтэграцыі мусульман з'яўляецца пераважна *пазітыўная ацэнка апытанымі адносін беларусаў да групы меншасці* (больш за 90% апытаных ацанілі іх у цэлым як станоўчыя) і *іх асобасных якасцяў*, якія станоўча ўплываюць на міжкультурны дыялог (талерантнасць (35,1%), верацярпімасць (27,8%), дружалюбнасць (20,2%), дабрыня (16,4%) і інш.).

Вынікі апытання ў цэлым сведчаць аб эфектыўнасці ажыццяўлення этнакультурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь, накіраванай на захаванне міжнацыянальнага міру і згоды ў грамадстве і забеспячэнне спрыяльных умоў для развіцця традыцыйнай культуры нацыянальных супольнасцяў. Аднак былі выяўлены патэнцыяльныя перашкоды для паспяховай інтэграцыі мусульман, а менавіта сярэдні ўзровень задаволенасці апытанымі этнакультурнай палітыкай, якасцю

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыйнага забеспячэння ў традыцыйных СМІ, разнастайнасцю культурных мерапрыемстваў, што патрабуе распрацоўкі комплексу рэкамендацый для аптымізацыі дзейнасці органаў кіравання па эфектыўным ажыццяўленні прынцыпаў этнакультурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь [4; 8; 11].

**4.** Рэкамендацыі па ўдасканаленні работы дзяржаўнай сістэмы кіравання па ажыццяўленні прынцыпаў этнакультурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь і інтэнсіфікацыі інтэграцыйных працэсаў сярод мусульманскай супольнасці ўключаюць чатыры асноўныя блокі: *палітыка-арганізацыйны, культурна-асветніцкі, інфармацыйна-забеспячальны, прафілактычны.*

*Палітыка-арганізацыйны* блок рэкамендацый прадугледжвае ўзмацненне ролі дзяржавы як асноўнага абаронцы правоў грамадзян у рэалізацыі прынцыпу свабоды веравызнання; падрыхтоўку рэлігійных кадраў у Рэспубліцы Беларусь; увядзенне ў адукацыйны працэс курсаў аб рэлігійнай свабодзе і талерантнасці; актыўнае ўключэнне мусульманскіх суполак у вырашэнне праблем інтэграцыі; правядзенне канферэнцый, сходаў па абмеркаванні асаблівасцяў інтэграцыйных працэсаў сярод мусульманскай супольнасці і распаўсюджванне іх вынікаў сярод шырокіх слаёў грамадскасці.

*Культурна-асветніцкі* блок уключае арганізацыю сумесных культурных мерапрыемстваў і праектаў розных фарматаў па ўзаемадзеянні мусульман і беларускага насельніцтва, па трансляцыі дасягненняў нацыянальных культур; стварэнне абавязковых для мусульман курсаў дзяржаўных моў; прадастаўленне дзяржавай магчымасці ажыццяўлення этнаканфесійнага дыялогу і інш.

*Інфармацыйна-забеспячальны* блок рэкамендацый прадугледжвае інфармаванне мусульман аб заканадаўстве Рэспублікі Беларусь і прынцыпах этнакультурнай і міграцыйнай палітыкі, што ажыццяўляецца ў краіне, аб сацыяльна-эканамічным і культурным развіцці і інфраструктуры рэгіёна, аб грамадскіх ініцыятывах і дзейнасці грамадскіх арганізацый; развіццё сацыяльных камунікатыўных пляцовак у інтэрнэце; развіццё існуючых і стварэнне новых СМІ, у якіх будзе асвятляцца грамадска-культурная дзейнасць мусульманскай супольнасці ў Рэспубліцы Беларусь з улікам асаблівасцяў мэтавай аўдыторыі, і г. д.

*Прафілактыка міжнацыянальнай варожасці* павінна ажыццяўляцца праз падтрымку сумесных формаў узаемадзеяння паміж мусульманамі і беларусамі з падкрэсліваннем агульнага гісторыка-культурнага мінулага і важнага значэння дасягненняў ісламскай супольнасці для айчыннай культуры; падтрымку актыўнай талерантнасці і салідарнасці паміж імі; арганізацыю сумесных мерапрыемстваў у сферы адукацыі, культуры і мастацтва і г. д. [4; 12].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

*Работнікам і органам дзяржаўнага кіравання:* вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны пры распрацоўцы мер па ўдасканаленні дзяржаўнай знешняй і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інтэграцыйнай палітыкі, а таксама сістэмы кіравання міграцыйнымі працэсамі ў Рэспубліцы Беларусь.

*Установам адукацыі:* асноўнымі вынікамі даследавання можна скарыстацца пры распрацоўцы вучэбных курсаў па культуралогіі, тэорыі і гісторыі культуры, гісторыі Беларусі, а таксама спецкурсаў па міжкультурнай камунікацыі, менеджменце ў сферы культуры.

*Спецыялістам, якія вывучаюць праблемы дыяспаралогіі:* сацыялагічныя дадзеныя і інструментарый даследавання могуць быць ужытыя як метадалагічная аснова для вывучэння працэсаў культурнай інтэграцыі мусульман у сацыякультурную прастору Рэспублікі Беларусь.

*Кіраўнікам культурна-асветніцкіх і іншых арганізацый:* вынікі і высновы даследавання могуць быць выкарыстаны пры выпрацоўцы мадэляў і стратэгій культурнай інтэграцыі мігрантаў у новым сацыякультурным асяроддзі. Распрацаваныя рэкамендацыі будуць спрыяць міжнацыянальнай згодзе і ўстойліваму дынамічнаму развіццю Рэспублікі Беларусь.

Асноўныя вывады дысертацыйнага даследавання былі выкарыстаны ў адукацыйным працэсе (ад 27.02.2018 г.) і пры арганізацыі культурна-асветніцкіх і выставачных праектаў (ад 15.02.2018 г., 26.07.2018 г., 12.03.2019 г.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА

## Артыкулы ў навуковых рэцэнзуемых часопісах


1. Татарэвіч, М. А. Акультурацыя суб'ектаў мусульманскай культуры на тэрыторыі Беларусі ў гістарычнай рэтраспектыве / М. А. Татарэвіч // Роднае слова. – 2017. – № 12. – С. 71–74.

2. Татарэвіч, М. А. Культурна-гістарычны кантэкст адаптацыі мусульман на беларускіх землях / М. А. Татарэвіч // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2018. – № 2. – С. 63–70.

3. Татарэвіч, М. А. Этнакультурная палітыка Рэспублікі Беларусь як фактар сацыякультурнай адаптацыі носьбітаў мусульманскай культурнай традыцыі / М. А. Татарэвіч // Весці БДПУ. – 2019. – Серыя 2. № 2. – С. 154–159.

4. Татарэвіч, М. А. Спецыфіка культурнай інтэграцыі мусульман у Беларусі / М. А. Татарэвіч // Весці БДПУ. – 2020. – Серыя 2. № 4. – С. 112–116.

5. Татаревич, М. А. Основные направления деятельности мусульманских общин на территории Республики Беларусь / М. А. Татаревич // Вести Ин-та соврем. знаний. – 2020. – № 4. – С. 91–95.


## Артыкулы ў навуковых зборніках


6. Татарэвіч, М. А. Інтэграцыйны характар міжкультурнай камунікацыі татараў на беларускіх землях [Электронны рэсурс] / М. А. Татарэвіч // Матэрыялы XVIII Міжнароднай навук.-практ. інтэрнэт-канф. "Гуманітарны прастор навукі: вопыт і перспектывы", Пераяслаў-Хмяльніцкі, 25 чэрвеня 2018 г.: зб. навук. прац / рэдкал.: В. П. Коцур [і інш.]. – Пераяслаў-Хмяльніцкі, 2018. – Вып. 18. – С. 59–63. – Рэжым доступу: https://humanitarica.webnode.com.ua. – Дата доступу: 12.01.2020.

7. Татаревич, М. А. Межэтнические отношения белорусов и мусульман как диалог культур [Электронный ресурс] / М. А. Татаревич // Материалы международного научного форума "Образование. Наука. Культура", Гжель, 21 ноября 2018 г.: сб. науч. ст. / под общ. ред. проф. Б. В. Илькевича; отв. ред. Н. В. Осипова. – Гжель: ГГУ, 2019. – С. 882–884 // ГГУ: [сайт]. – Режим доступа: http://www.art-gzhel.ru/. – Дата доступа: 15.02.2020.

8. Татарэвіч, М. А. Трансфармацыя абрадаў беларускіх татар у кантэксце іх сацыякультурнай адаптацыі / М. А. Татарэвіч // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання (памяці антраполага З. Мажэйкі) : зб. навук. прац / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў; рэдкал.: В. Языковіч (старш.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2019. – С. 92–94.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9. Татарэвіч, М. А. Дзейнасць мусульманскіх аб’яднанняў як інструмент інтэграцыі носьбітаў ісламскай культурнай традыцыі ў Беларусі / М. А. Татарэвіч // Религия и общество – 14 : сб. науч. ст. / под общ. ред. В. В. Старостенко, О. В. Дьяченко. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2020. – С. 218–220.

10. Татарэвіч, М. А. Хрысціянска-мусульманская камунікацыя ў сацыякультурнай прасторы Беларусі ва ўмовах глабалізацыі / М. А. Татарэвіч // Социальные, культурные и коммуникативные практики в динамике общественного развития : сб. науч. ст. / ГрГУ им. Янки Купалы; редкол.: Т. А. Пивоварчик (гл. ред.) [и др.]. – Гродно : ГрГУ, 2020. – С. 183–185.

11. Татарэвіч, М. А. Культурная інтэграцыя мусульман у сучаснае беларускае грамадства / М. А. Татарэвіч // Культура. Наука. Творчество : XIV Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 75-летию Великой Победы и 45-летию БГУКИ, Минск, 14 мая 2020 г. : сб. науч. ст. / М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств; редкол.: А. А. Корбут [и др.]. – Минск : БГУКИ, 2020. – С. 407–411.

12. Татаревич, М. А. Белорусская культура в формировании этноконфессионального диалога / М. А. Татаревич // Современное общество: актуальные проблемы и перспективы развития в социокультурном пространстве : сб. науч. тр. / под ред. Г. Н. Петрова; БОУ ВО “ЧГИКИ” Минкультуры Чувашии. – Чебоксары : Плакат, 2020. – С. 239–244.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

13. Татарэвіч, М. А. Культурная інтэграцыя татар на тэрыторыі Беларусі: рэтраспектыва і перспектыва / М. А. Татарэвіч // Культура Беларусі: рэаліі сучаснасці : Трансфармацыя традыцыйных каштоўнасцей у інфармацыйным грамадстве : матэрыялы V Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 27 верасня 2016 г. / уклад.: І. Б. Лапцёнак, А. А. Галкін, І. Р. Голубева; рэдкал.: І. Б. Лапцёнак [і інш.]. – Мінск : Інстытут культуры Беларусі, 2016. – С. 290–293.

14. Татаревич, М. А. Аккультурация татар на территории Беларуси / М. А. Татаревич // Культура народов Причерноморья с древнейших времен до наших дней : XLI Междунар. науч. чтения, 23–24 ноября 2017 г. : сб. материалов конф. / Крымский федеральный ун-т им. В. И. Вернадского; редкол.: Д. С. Берестовская [и др.]. – Симферополь, 2018. – С. 161–167.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РЭЗЮМЭ

## ТАТАРЭВІЧ МАРЫНА АЛЯКСАНДРАЎНА

## КУЛЬТУРНАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ НОСЬБІТАЎ МУСУЛЬМАНСКАЙ ТРАДЫЦЫІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

**Ключавыя словы:** індыкатары культурнай інтэграцыі, культурная інтэграцыя, мусульманская культура, мусульманская супольнасць, носьбіты мусульманскай традыцыі.

**Мэта даследавання:** выяўленне асаблівасцяў культурнай інтэграцыі сучасных мусульман на тэрыторыі Беларусі.

**Метады даследавання:** метад тэарэтычнай рэканструкцыі, дыяхранічны і сінхранічны метады, структурна-функцыянальны, узыходжанне ад абстрактнага да канкрэтнага, метад анкетавання, уключанае назіранне, глыбіннае інтэрв'ю, якасны кантэнт-аналіз, праектны метад.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** Дысертацыя ўяўляе сабой першае комплекснае культуралагічнае даследаванне асаблівасцяў культурнай інтэграцыі сучасных мусульман у Беларусі. У рабоце разгледжаны кантэкст культурнай інтэграцыі носьбітаў мусульманскай традыцыі; вызначаны асноўныя гісторыка-культурныя перыяды культурнай інтэграцыі мусульман і дадзена іх характарыстыка; абгрунтавана грамадска-культурная дзейнасць мусульман на сучасным этапе як адзін з паказчыкаў іх паспяховай культурнай інтэграцыі на групавым узроўні (на прыкладзе дзейнасці рэлігійных абшчын і рэалізаваных праектаў у сферы культуры і мастацтваў); вылучаны асноўныя індыкатары культурнай інтэграцыі носьбітаў мусульманскай традыцыі праз правядзенне апытання асобных яе прадстаўнікоў; распрацаваны навукова-практычныя рэкамендацыі па інтэнсіфікацыі інтэграцыйных працэсаў сярод мусульманскай супольнасці ў Рэспубліцы Беларусь.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні.** Вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны з мэтай удасканалення дзяржаўнай этнакультурнай і міграцыйнай палітыкі; пры распрацоўцы спецкурсаў па міжкультурных зносінах; пры арганізацыі сумесных міжкультурных праектаў у сферы культуры і мастацтва. Асноўныя вывады саіскальніка былі выкарыстаны ў адукацыйным працэсе (ад 27.02.2018 г.), пры арганізацыі культурна-асветніцкіх і выставачных праектаў міжнароднага, рэспубліканскага і рэгіянальнага ўзроўняў (ад 15.02.2018 г., 26.07.2018 г., 12.03.2019 г.).

**Сфера выкарыстання:** культуралогія, тэорыя і гісторыя культуры, гісторыя Беларусі, менеджмент у сферы культуры, міжкультурная камунікацыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РЕЗЮМЕ

**ТАТАРЕВИЧ МАРИНА АЛЕКСАНДРОВНА**

## КУЛЬТУРНАЯ ИНТЕГРАЦИЯ НОСИТЕЛЕЙ МУСУЛЬМАНСКОЙ ТРАДИЦИИ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ

**Ключевые слова:** индикаторы культурной интеграции, культурная интеграция, мусульманская культура, мусульманское сообщество, носители мусульманской традиции.

**Цель исследования:** выявление особенностей культурной интеграции современных мусульман на территории Беларуси.

**Методы исследования:** метод теоретической реконструкции, диахронический и синхронический методы, структурно-функциональный, восхождение от абстрактного к конкретному, метод анкетирования, включенное наблюдение, глубинное интервью, качественный контент-анализ, проектный метод.

**Полученные результаты и их новизна.** Диссертация является первым комплексным культурологическим исследованием особенностей культурной интеграции современных мусульман в Беларуси. В работе рассматривается контекст культурной интеграции носителей мусульманской традиции; определены основные историко-культурные периоды культурной интеграции мусульман и дана их характеристика; обоснована социокультурная деятельность мусульман на современном этапе как один из показателей их успешной культурной интеграции на групповом уровне (на примере деятельности религиозных общин и реализованных проектов в области культуры и искусства); выделены основные индикаторы культурной интеграции носителей мусульманской традиции путем опроса отдельных ее представителей; разработаны научно-практические рекомендации по интенсификации интеграционных процессов среди мусульманского сообщества Республики Беларусь.

**Рекомендации по применению.** Результаты диссертационного исследования могут быть использованы для совершенствования государственной этнокультурной и миграционной политики; при разработке специальных курсов по межкультурной коммуникации; при организации совместных межкультурных проектов в сфере культуры и искусства. Основные выводы соискателя были использованы в учебном процессе (от 27.02.2018 г.), при организации культурных, образовательных и выставочных проектов международного, республиканского и регионального уровней (от 15.02.2018 г., 26.07.2018 г., 12.03.2019 г.).

**Область применения:** культурология, теория и история культуры, история Беларуси, менеджмент в сфере культуры, межкультурная коммуникация.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## SUMMARY

## TATAREVICH MARINA

## CULTURAL INTEGRATION OF MUSLIM TRADITION BEARERS IN THE TERRITORY OF BELARUS

**Keywords:** cultural integration, cultural integration indicators, Muslim culture, Muslim community, Muslim tradition bearers.

**The purpose of research** is to identify the modern Muslims' cultural integration features in the territory of Belarus.

**Methods:** theoretical reconstruction, diachronic and synchronic methods, structural and functional methods, ascent from the abstract to the concrete, questionnaire method, participatory observation, in-depth interview, qualitative content analysis, project method.

**The results and its innovation.** The dissertation is the first comprehensive cultural study of the modern Muslims' cultural integration features in Belarus. The author examines the context of cultural integration among Muslim tradition bearers; identifies the main historical and cultural periods of Muslims' cultural integration and their characteristics; substantiates the Muslims' socio-cultural activities at the present stage as indicator of their successful cultural integration at the group level (on the example of the religious communities' activities and implemented projects in the field of culture and art); highlights the main cultural integration indicators of the Muslim tradition bearers by polling its individual representatives; develops the scientific and practical recommendations to intensify integration processes among Muslim community in Belarus.

**Fields of application.** The results of the dissertation research can be used to improve the state ethnocultural and migration policy; in the developing special courses on intercultural communication; in the organizing joint intercultural projects in the field of culture and art. The main conclusions of the applicant were used in the educational process (from 27.02.2018), for organizing cultural, educational and exhibition projects at the international, national and regional levels (from 15.02.2018, 26.07.2018, 12.03.2019).

**Scope:** culturology, theory and history of culture, history of Belarus, management in the sphere of culture, intercultural communication.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навуковае выданне

**ТАТАРЭВІЧ МАРЫНА АЛЯКСАНДРАЎНА**

# КУЛЬТУРНАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ НОСЬБІТАЎ МУСУЛЬМАНСКАЙ ТРАДЫЦЫІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

**АЎТАРЭФЕРАТ**

дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата культуралогіі па спецыяльнасці
24.00.01 – тэорыя і гісторыя культуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падпісана да друку 23.04.2021. Фармат 60×84 1/16
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,5. Ул.-выд. арк. 1,55.
Тыраж 100 экз. Заказ 690.

Паліграфічнае выкананне:
УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.